Падтрымай "Вясну" на PATREON

Тры гады "хатняй хіміі" прысудзілі Дзмітрыю Лекамцаву за смс-паведамленні з пагрозамі

24.08.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Суд Мінскага раёна. Фота yandex.by

У Мінскім раённым судзе 24 жніўня агучылі прысуд па крымінальнай справе ў адносінах да Дзмітрыя Лекамцава, якога вінавацілі ў пагрозе прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка міліцыі (арт. 364 Крымінальнага кодэкса).

Справу разглядаў суддзя **Антон Колабаў**, бок дзяржабвінавачвання прадстаўляла **Крысціна Касінская**. Пацярпелым па справе быў прызнаны **Сяргей Сямёнаў**, які ў суд не з'явіўся праз занятасць па службе.

Паводле абвінавачвання, Дзмітрый Лекамцаў у стане алкагольнага ап'янення вечарам 16 жніўня 2020 года адправіў смс-паведамленні супрацоўніку Рагачоўскага РАУС, начальніку ІЧУ горада Сяргею Сямёнаву, у тэксце якога меліся прыкметы вербальнай агрэсіі ў форме пагрозы ў адрас міліцыянта і яго блізкіх у сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Такія дзеянні абвінавачанага былі расцэненыя як пагроза прымяння гвалту ў дачыненні да супрацоўніка АУС і/ці яго блізкіх і кваліфікаваныя паводле арт. 364 Крымінальнага кодэкса.

Лекамцаў прызнаў віну цалкам, у судзе абараняў сябе сам. Ён адзначыў, што раскайваецца, ездзіў да пацярпелага, прыносіў выбачэнні, Сямёнаў іх прыняў. З пацярпелым ніколі не быў знаёмы, у Рагачове таксама ніколі не быў. Абвінавачаны патлумачыў, што ў сувязі з пратэстамі пасля выбараў людзі станавіліся ў ланцугі салідарнасці і ў горадзе сігналілі машыны, яго гэта раздражняла, бо ён быў у стане алкагольнага ап'янення. Ён падыходзіў да людзей, спрабаваў з імі размаўляць, адбылася сварка. Пасля гэтага Лекамцаў прыйшоў дадому, выйшаў у сацыяльную сетку "Аднакласнікі", а там у стужцы пабачыў інфармацыю пра начальніка ІЧУ г. Рагачова, дзе было напісана, што Сямёнаў запужвае маленькіх дзяцей, жанчын і старых. Таксама ў допісе быў пазначаны тэлефон пацярпелага. Лекамцаў таксама патлумачыў, што раней служыў у войску, у Нагорным Карабаху бачыў жанчын і дзяцей - бежанцаў, якія ў яго зафіксаваліся ў памяці, таму ён спрабаваў патэлефанаваць на пазначаны тэлефон Сямёнава, але там ніхто не адказваў. Тады Дзмітрый напісаў тры ці чатыры смс-паведамленні, але дакладна змест іх не памятае. Пазней зразумеў, што памыліўся, прынёс прабачэнні, прапаноўваў кампенсацыю, але Сямёнаў адмовіўся.

З матэрыялаў справы стала зразумела, што паведамленні былі наступнага зместу:

> *"Што засц*ў камунікаваць? Табе звоняць з арганізацыі ветэранаў, спецпадраздзялення памежных войскаў СССР. Рыхтуйся поскудзь, час надыйшоў: ці суд, ці знішчэнне. І бойся за сваю сям'ю і родных. Каму ты пагражаў і як адносіўся, так будзе і з табой".*
>
> *"Пацук, што маўчыш? Язык у ж*пе, пачвара ментаўская... <неразборліва>"*
>
> *"Лукашэнка не будзе, а вы – поскудзь, за ўсё будзеце адказваць і не толькі, а вашыя родныя і блізкія. Поскудзь, якую выхавалі".*

Была праведзеная лінгвістычная экспертыза, па выніках якой паведамленні ўтрымлівалі негатыўную ацэнку Сяргея Сямёнава, а таксама вербальную агрэсію і пагрозы гвалтам. У судзе зачыталі пратакол апытання пацярпелага, у якім адзначалася, што начальнік ІЧУ баяўся за сябе і сваіх родных.

Падчас спрэчак бакоў Крысціна Касінская прасіла суд прызнаць Лекамцава вінаватым і прызначыць пакаранне ў выглядзе **абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на тры гады**, а таксама канфіскаваць тэлефон.

Менавіта такое пакаранне і прызначыў суддзя Антон Колабаў.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY